Такім чынам, стварэнне сцэнічнага эцюда па карціне мастака ў мініяцюры нагадвае працэс стварэння спектакля.

Стварэнне сцэнічнага эцюда па творах жывапісу ўжо ў першы год навучання раскрывае перад студэнтам складанасць выбранай прафесіі і, пакуль у элементарнай форме, няўмольна патрабуе ад яго ведаў і ўмення, здольнасці і працы.

Сцэнічная выразнасць нараджаецца ад найбольш глыбіннага раскрыцця ўнутранай сутнасці. Для гэтага студэнту неабходны навыкі ўвасаблення вобразнага бачання.

Адначасова з засваеннем прафесійных навыкаў студэнт развівае асабістую псіхатэхніку: мастацка-вобразнае мысленне і псіхалагічнае сумяшчэнне рацыянальнага і эмацыянальнага ў тэатральнай творчасці.

І галоўнае – акрэсліваць асабістую маральна-духоўную пазіцыю.

Гэты важны этап у набыцці прафесіі мае ўплыў і на іншыя старонкі выхавання студэнта.

Багацейшая спадчына найбуйнейшай у свеце славянскай школы тэатральнай адукацыі арганічна ўваходзіць у навучальны працэс і актыўна выкарыстоўваецца выкладчыкамі кафедры тэатральнай творчасці ў іх планавай дзейнасці.

Асэнсаванне вопыту па выхаванню студэнтаў рэжысёрскіх спецыялізацый метадам стварэння сцэнічных эцюдаў па творах мастакоў лагічна падштурхоўвае да думкі аб спробе прымянення ў навучальным працэсе эцюдаў па творах скульптараў і майстроў дакументальных і мастацкіх фотаздымкаў.

Гэта задума патрабуе дасканалага і абгрунтаванага выніку практычна-творчага эксперыменту працяглясцю 1 - 1,5 месяцы ў адной з груп кафедры тэатральнай творчасці Беларускага універсітэта культуры.

**Рынкевіч У.І.,**
дацэнт

## РЭАЛІЗАЦЫЯ ТВОРЧАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ СТУДЭНТАЎ НА ЗАНЯТКАХ ПА ЖЫВАПІСЕ

Галоўнай задачай навучальных мастацкіх устаноў з'яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў з трывалымі ведамі і навыкамі ў галіне выяўленчага мастацтва, здольных да мастацтва, здольных да актыўнай творчай працы. Таму вельмі важна, каб вывучэнне асноўных законаў і авалодание выразнымі сродкамі тых ці іншых відаў мастацтва спалучалася з набыццём вопыту самастойнай мастацкай практыкі.

Прапанаваны матэрыял з'яўляецца вынікам абагульнення вопыту выкладання дысцыпліны «Жывапіс» на 1-2 курсах спецыялізацыі «народныя рамёствы». Праграма прадмета пабудавана па прынцыпу паступовага пашырэння значнасці элементаў творчага пачатку ў вучэбных заданнях, а таксама прадугледжвае стварэнне ўмоў для самастойнай творчай працы студэнтаў. Найбольш складаныя аўдыторныя заданні выконваюцца мастаком-выкладчыкам паралельна з работай вучняў.

На першапачатковым этапе навучання пераважнай формай заняткаў па жывапісе з'яўляецца праца з натуры. Аднак наша задача не зводзіцца да перадачы студэнтам вонкавага падабенства нацюрморта або краявіда. Натура выконвае ролю аб'екта рэчаіснасці, на аснове якога складаюцца кампазіцыя танальных плямаў і сістэма колеравых адносін з пэўнай доляй умоўнасці. З аднаго і таго ж аб'екта адлюстравання можа быць створана некалькі варыянтаў работ, якія адрозніваюцца кампазіцыяй, каларытам, прыёмам выканання. Асноўнай цяжкасцю для першакурснікаў з'яўляецца пераадоленне інерцыі размалёўкі контураў выявы і набыццё ўмення мысліць колеравымі адносінамі, ствараць гармонію колераў. У далейшым задача ўскладняецца перадачай матэрыяльнасці рэчаў і стварэннем багацця жывапісных фактур.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

На другім этапе, з набыццём пэўнага прафесійнага майстэрства, поле творчай дзейнасці ў вучэбных заданнях значна пашыраецца. Напрыклад, у рабоце над нацюрмортам непарушнымі застаюцца толькі тэма («Вясновы нацюрморт», «Свет мастацтва») і некаторыя натурныя рэчы, якія ствараюць яго аснову. Студэнт вызначае ідэйны і эмацыянальны змест будучага твора, фарміруе ў межах прапанаванай тэмы прасторава-рэчавае асяроддзе і знаходзіць, адпаведна задуме, выразныя сродкі. Такім чынам, карыстаючыся амаль што адным і тым жа натурным матэрыялам, кожны студэнт стварае сваю асабістую вобразную інтэрпрэтацыю тэматычнага нацюрморта.

Найбольшай творчай самааддачы патрабуюць ад студэнта заданні па стварэнню тэматычных кампазіцый («Адзінота», «Бег часу», «Святло»), якія выконваюцца самастойна пасля заняткаў. Яны накіраваны на развіццё філасофскага мыслення, умення, мастацкага абагульнення. Шляхі раскрыцця тэмы могуць быць самымі рознымі: ад натуралістычнай апавядальнасці да фармальных колеравых выражэнняў у залежнасці ад індывідуальных схільнасцей і манеры студэнта.

Самастойная работа студэнтаў у большай ступені носіць творчы характар, чым выкананне праграмных заданняў. Гэтаму спрыяюць асабістая зацікаўленасць у выбары тэмы, вызначэнне ідэі твора, адсутнасць адказнасці перад выкладчыкам, вольнасць імправізацый, шырыня выкарыстання тэхнічных эксперыментаў і г.д. Тым не менш кантакты або дапамога з боку выкладчыкаў не толькі не лішнія, але часам неабходныя (напрыклад, пры паказе складанага тэхнічнага прыёму, кваліфікаваным аналізе твора). Менавіта гэтыя задачы прызваны рашаць аматарскі гурток акварэлістаў. Яго работа праяўляецца ў трох асноўных формах. Па-першае, індывідуальная работа са студэнтамі — аналітычны разбор творчых прац. Па-другое, калектыўныя заняткі -- дэманстрацыя працэсу жывапісу і гатовых работ настаўніка. Па-трэцяе, экскурсіі на выстаўкі, у творчыя майстэрні мастакоў і арганізацыя паказу студэнцкіх творчых работ. Апошняе з'яўляецца моцным стымулюючым фактарам у развіцці творчага патэнцыялу будучых мастакоў.

Марц'янава М.В.,
выкладчык

## «НАРОДНЫЯ ПАЯСЫ»: ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

«Народныя паясы» -- раздзел навучальнага курса «Народнае ткацтва», які не патрабуе складанага абсталявання. Гэтае рамяство можна выкладаць і развіваць усюды, куды прыдуць на педагагічную працу выпускнікі кафедры народных рамёстваў.

Вядома, што ў традыцыйнай культуры славян пояс быў вельмі важным элементам адзення, а таксама ўжываўся ў многіх абрадах. Лічылася, што пояс аберагае ад розных няшчасцяў; ён быў нібы магічнае кола для таго, хто яго насіў. Адсутнасць пояса ў касцюме была парушэннем агульнапрынятых норм паводзін.

Арнаменты на паясах мелі сімвалічныя знакі, ужо забытыя ў народзе, але захаваныя ў працах навукоўцаў (М.Кацар, Я.Сахута).

З парушэннем традыцыйнай культуры паясы не адышлі адразу ў небыццё, але значна страцілі сваю ролю; іх перасталі выраблять у многіх рэгіёнах.

Новы від паясоў -- сувеніры -- узнік у 60-х гадах на Слуцкай фабрыцы мастацкіх вырабаў. Шырокія шматкаляровыя паясы -- стужкі -- выраблялісі для падарункаў шаноўным гасцям Беларусі, юбілярам, арганізацыям. Акрамя традыцыйных арнаментальных элементаў, у кампазіцыю паясоў уваходзілі надпісы, сучасныя сімвалы і арнаменты.

З сярэдзіны 80-х гадоў пачалося адраджэнне народных паясоў. Вялікую ролю ў гэтым адыграла мастацтвазнаўца Вера Селіванчык, якая ў 1989 годзе выдала дапаможнік па вырабу паясоў. У 1992 г. у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ